# СТАГАДОВЫ ШЛЯХ

## Камуністычная партыя Кітая адзначае юбілей

**Сёння ў Паднябеснай адметнае свята — найвялікшая ў свеце краіна (ды і не толькі ўласна яна — падзея насамрэч сусветнага маштабу) адзначае 100-годдзе ўтварэння Камуністычнай партыі Кітая. Яна ўпісала слаўныя старонкі ў гісторыю развіцця кітайскай нацыі і прагрэсу чалавецтва за апошняе стагоддзе, заявіў генеральны сакратар ЦК КПК Сі Цзіньпін (таксама з'яўляецца старшынёй КНР і старшынёй Цэнтральнага ваеннага савета) на цырымоніі ўручэння ордэнаў Першага ліпеня. Аб гэтым паведаміла інфармагенцтва «Сіньхуа». Ордэн выкананы ў чырвоным, залатым і белым колерах, ён мае эмблему партыі і пяціканцовую зорку. Адразу адзначу: найвышэйшыя партыйныя ўзнагароды кіраўнік Кітая ўручыў упершыню. «Лаўрэаты ордэна Першага ліпеня — выхадцы з народу. Гэта простыя героі, якія моўчкі адданыя сваёй справе. Іх справы можна вывучаць і паўтараць», — адзначыў Сі Цзіньпін.**




### ЗРАЗУМЕЦЬ ПАДНЯБЕСНУЮ

Першыя ўладальнікі ордэнаў — 29 найбольш выбітных членаў КПК. Урачыстая цырымонія, прымеркаваная да святкавання 100-годдзя КПК, адбылася ў Доме народных сходаў у Пекіне. Як заўважыў Сі Цзіньпін, сваімі дзеяннямі лаўрэаты ордэна даказалі, што кожны член КПК можа дамагчыся вялікіх поспехаў для партыі і для народа ў вялікай справе нацыянальнага адраджэння, калі ён цвёрды ў сваіх ідэалах і перакананнях, цвёрды ў сваёй волі да барацьбы, у сваёй упартасці, што можна ўбачыць як у звычайны час, так і ў крытычныя моманты.

Сярод першых лаўрэатаў ордэна — восем жанчын і 21 мужчына. З іх некалькі доўгажыхароў, самаму сталаму з якіх 101 год. Трое былі ўзнагароджаны ордэнам пасмяротна. Ад імя лаўрэатаў на цырымоніі выступіла 64-гадовая Чжан Гуймэй. Больш за 40 гадоў яна правяла ў бедных раёнах Кітая, дзе стварала адукацыйныя ўстановы для дзяўчынак. Дзякуючы ёй амаль дзве тысячы дзяўчат з аддаленых раёнаў і вёсак змаглі паступіць у вышэйшыя навучальныя ўстановы. У народзе яе таксама называюць «мама Чжан».

Адным з уладальнікаў узнагароды стала былая выхаванка Іванаўскага інтэрдома 99-гадовая Цюй Дуі, з 1928 да 1941 года яна жыла ў Савецкім Саюзе. Пазней сярод першых кітайскіх карэспандэнтаў за мяжой была накіравана на работу ў Маскву.

Кітай прытрымліваецца унікальнай мадэлі развіцця, якая адрозніваецца ад заходніх краін. КНР дасягнула беспрэцэдэнтнага ў гісторыі чалавецтва развіцця як па хуткасці, так і па маштабе, адзначае «Жэньмінь жыбаа» анлайн», з якой, дарэчы, «Звязда» вось ужо на працягу амаль шасці гадоў ажыццяўляе сумесны праект «Весткі з Кітая». Такі вынік не толькі спрыяльны для Кітая, але і заахвочвае ўсё большую колькасць краін ісці па сваім шляху развіцця, вывучаць найлепшую сацыялістычную сістэму. Напярэдадні 100-годдзя заснавання КПК «Жэньмінь жыбаа» анлайн» прэзентаваў надзвычай цікавую рубрыку «Зразумець Кітай». Партал праводзіць гутаркі з міжнароднымі палітыкамі, кітайскімі і замежнымі навукоўцамі, з дапамогай розных меркаванняў спрабуе апісаць сапраўдны, шматгранны і ўсебаковы Кітай.

Многія лічаць, што цяпер у Кітаі ёсць толькі адна палітычная партыя, але гэта не так. Акрамя КПК, у краіне афіцыйна дзейнічаюць яшчэ восем дэмакратычных партый. Усе яны прадстаўлены ў заканадаўчым органе Кітая — Усекітайскім сходзе народных прадстаўнікоў, паведаміла ria.ru. У той жа час кіруючая роля нязменна адводзіцца Камуністычнай партыі. Пад яе кіраўніцтвам за апошнія 40 гадоў у Кітаі прайшлі маштабныя рэформы, у выніку якіх жыццё кітайцаў змянілася да непазнавальнасці, а ВУП у сярэднім рос на 9,5 % у год. І калі ВУП на душу насельніцтва ў 1991 годзе ў краіне складаў 333 долары, то да 2019 года паказчык вырас больш чым у 30 разоў — да 10,2 тысячы долараў.

Поспехі Паднябеснай проста ўражваюць. Кітайская эканоміка вырасла прыкладна ў 189 разоў у рэальным выражэнні з моманту ўтварэння Кітайскай Народнай Рэспублікі, заявіў прадстаўнік Цэнтральнай камісіі па фінансавых і эканамічных справах Хань Вэньсю, паведаміла «Сіньхуа». Паводле яго інфармацыі, аб'ём валавога ўнутранага прадукту Кітая перавышае 100 трлн юаняў (каля 15,5 трыльёна долараў). Паднябесная з'яўляецца другой па велічыні эканомікай свету, а доля краіны ў сусветнай эканоміцы павялічылася да больш чым 17 працэнтаў.



### ЯК ПЕРАМАГЧЫ БЕДНАСЦЬ І КАРАНАВІРУС?

Маленькія мястэчкі ператварыліся ў мегаполісы з гіганцкімі дарожнымі развязкамі і хмарачосамі, кітайскія хуткасныя цягнікі сталі самымі хуткімі, а аўтамагістралі ўваходзяць у тройку самых працяглых у свеце. Спіс самых-самых на гэтым не заканчваецца. Сёлета ў Кітаі запрацаваў найдаўжэйшы падводны тунэль для аўтамабіляў. Пры гэтым краіна таксама на першым месцы па будаўніцтве аўтамабільных мастоў і вытворчасці аўто. Праз два гады выпрабаванняў летась у КНР запрацаваў самы вялікі ў свеце радыётэлескоп. Найбуйнейшы ў свеце высакагорны акварыум на вышыні 2,2 тысячы метраў над узроўнем мора ў Сініні і самы вялікі міжнародны аэрапорт «Дасін» у Пекіне — таксама кітайскія.

Зрэшты, гэта не галоўныя дасягненні кітайскіх улад. У 2020 годзе старшыня КНР Сі Цзіньпін абвясціў аб выкараненні крайняй галечы ў краіне. У 1990 годзе 36,2 % насельніцтва Зямлі жыло за рысай беднасці па стандартах Сусветнага банка. У 2018 годзе такіх было 8,7 %, і вялікі ўклад у сусветную барацьбу з беднасцю ўнёс менавіта Кітай.

Акрамя таго, практычна ўсе грамадзяне забяспечаны базавай медыцынскай страхоўкай, бяспечным жыллём і доступам да адукацыі. Усё гэта паспяхова дасягнутыя мэты па пабудове грамадства сярэдняй заможнасці. Летась у Кітаі паспяхова ўдалося ўзяць пад кантроль пандэмію каранавіруса.

Сто гадоў — вельмі важная юбілейная дата, якая дазваляе паглядзець на дасягненні Кітая ў кантэксце макрагісторыі, заўважыў ria.ru кіраўнік Школы ўсходазнаўства факультэта сусветнай эканомікі і сусветнай палітыкі НДУ ВШЭ Андрэй Карнееў. «Калі зірнуць на больш працяглыя заканамернасці ў гісторыі Кітая, можна ўбачыць, што гэтая краіна на працягу некалькіх тысячагоддзяў гісторыі зведала самыя розныя перыяды — і пад'ём, і заняпаду. У ёй кіравалі вялікія дынастыі, якія ўнеслі ў скарбонку чалавечай цывілізацыі мноства дасягненняў у галіне культуры і тэхналогій, — кажа эксперт. — Аднак рэдка бывае, калі за такі кароткі перыяд такая вялізная колькасць людзей атрымлівае магчымасць вырвацца з галечы і адсталасці, дасягае сярэдневысокага па сусветных мерках узроўню развіцця. Гэта ўнікальнае ў сусветнай гісторыі дасягненне, якое многія яшчэ не паспелі асэнсаваць, паколькі яно адбываецца на нашых вачах».

Сёння КНР дэманструе ўпэўненасць у сабе і сваёй будучыні, дадаў Карнееў. І што важна: гэта не толькі перакананне кіраўнікоў ЦК КПК — пазітыўны настрой падзяляецца большасцю насельніцтва. «Яны ўпэўнены, што краіне трэба будзе перахапіць факел эканамічнага першынства, — заўважыў эксперт. — Праўда, некаторыя кажуць, што ў гэтым няма нічога дзіўнага, бо некалькі стагоддзяў таму Кітай ужо быў сусветным лідарам, а Еўропа вырвалася наперад толькі потым. Зараз жа Кітай проста вяртаецца да свайго стану сярэдзіны свету. І калі трэнд працягнецца, мы будзем сведкамі новых тэндэнцый у сусветным раскладзе».

### МОЦНЫЯ РАЗАМ

Зараз у Мінску можна на свае вочы пабачыць той самы велічны стагадовы шлях КПК. У Музеі Вялікай Айчыннай вайны разгарнулася міжнародная перасоўная выстава «100 гадоў Камуністычнай партыі Кітая». Як адзначыў на яе адкрыцці Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол КНР у Беларусі Се Сяаюн, гэтае стагоддзе цалкам змяніла шматпакутны лёс кітайскай нацыі ў перыяд новай гісторыі.

«Пасля Опіумнай вайны 1840 года стары Кітай аказаўся пад пагрозай гібелі дзяржавы і знікнення нацыі. Незлічоная колькасць людзей з высокімі ідэаламі і мараллю нястомна былі ў пошуку, але не здолелі карэнным чынам змяніць трагічны лёс кітайскай нацыі, якая падвяргалася ўціскам і здзекам, — заўважыў кітайскі дыпламат. — Пасля заснавання Камуністычнай партыі Кітая ў 1921 годзе быў вызначаны вектар новадэмакратычнай рэвалюцыі. Пасля аграрнай рэвалюцыйнай вайны, вайны Супраціву японскім захопнікам і Вызваленчай вайны партыя заснавала Кітайскую Народную Рэспубліку, паўнапраўным гаспадаром якой стаў народ, дамаглася поўнага вызвалення і незалежнасці кітайскай нацыі, канчаткова скончыла з унутранымі праблемамі і знешняй агрэсіяй, а таксама з бедным і аслабленым трагічным становішчам краіны. Кітайскі народ на чале з Маа Цзэдунам ступіў у новую гістарычную эпоху. У пачатку заснавання новага Кітая краіна была беднай і адсталай, усе галіны мелі патрэбу ў адраджэнні. Былі зацверджаны асноўныя інстытуты сацыялізму, пачалася індустрыялізацыя краіны. Кітайскія камуністы на чале з Дэн Сяапінам, Цзян Цзэмінем і Ху Цзіньтаа садзейнічалі дасягненню новых поспехаў у эканамічным, палітычным, сацыяльным, культурным і экацывілізацыйным будаўніцтве краіны, вялі кітайскі народ сямімільнымі крокамі ў нагу з часам і ажыццяўлялі імклівы ўздым кітайскай нацыі».

Як заўважыў Се Сяаюн, пасля XVIII з'езда ЦК КПК сацыялізм з кітайскай спецыфікай уступіў у новую эпоху. «Падчас глыбокіх змяненняў, а таксама нябачаных за апошняе стагоддзе перамен у свеце кітайскія камуністы на аснове адзінага планавання рэалізоўвалі агульную схему, якая аб'ядноўвае ў адзінае цэлае эканамічнае, палітычнае, культурнае, сацыяльнае і экацывілізацыйнае будаўніцтва, узгоднена ажыццяўлялі ўсебаковую стратэгічную канцэпцыю, зацвердзілі ідэі Сі Цзіньпіна пра сацыялізм з кітайскай спецыфікай новай эпохі», — заўважыў дыпламат.

Кітайская нацыя здзейсніла імклівы скачок — устала на ногі, сацыялістычны Кітай выйшаў на новы этап развіцця і адкрыў новы гістарычны шлях усебаковай пабудовы мадэрнізаванай сацыялістычнай дзяржавы, адзначыў Се Сяаюн. Удалося паспяхова дасягнуць мэты першай стагадовай барацьбы — усебаковай пабудовы сярэднезаможнага грамадства. «Зараз кітайскі народ на шляху дасягнення мэты другога стагоддзя — пабудовы квітнеючай, дэмакратычнай, цывілізаванай, гарманічнай, мадэрнізаванай сацыялістычнай дзяржавы», — падкрэсліў пасол.

«Станаўленне Рэспублікі Беларусь як незалежнай дзяржавы беларускага народа ў XX стагоддзі непарыўна звязана з гісторыяй сусветнага камуністычнага руху. Камунізм выступіў той палітычнай сілай, якая забяспечыла народам свету, уключаючы кітайскі і беларускі, правы на нацыянальнае самавызначэнне і пабудову справядлівага грамадства, — адзначыў першы намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Мікалай Снапкоў. — Калісьці менавіта ў Мінску, які стаў потым сталіцай Беларусі, прайшоў першы з'езд расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі, якая выступіла калыскай ідэй марксізму-ленінізму. Сёння КПК з'яўляецца тэарэтычным і практычным авангардам сусветнага камуністычнага руху, а мы з задавальненнем адзначаем гэта, беражліва захоўваючы памяць пра гістарычныя вытокі».

Мікалай Снапкоў працытаваў выказванне генеральнага сакратара ЦК КПК Сі Цзіньпіна: «Для партыі, якая змагаецца за вечны дабрабыт кітайскай нацыі, стагадовая гадавіна — адзначэнне росквіту жыцця». «Мы шчыра рады поспехам нашых кітайскіх сяброў у дасягненні першай стагадовай мэты — пабудове сярэднезаможнага грамадства ў Кітаі і перамозе над беднасцю. Беларусь разам з Кітаем рэалізоўвае канцэпцыю супольнасці адзінага лёсу чалавецтва, якая вылучана кітайскім лідарам і змяшчае сумленнае і адкрытае бачанне свету для ўсіх народаў. У сучасных рэаліях міжнародных адносін як ніколі актуальныя заклікі Кітая да рэфармавання глабальнага кіравання на аснове ідэй аб узаемнай дапамозе і гарманічным суіснаванні ўсіх краін пры захаванні і павазе адрознення», — заўважыў першы віцэ-прэм'ер.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**